https://nashaniva.com/387103

Новы помнік у Вільні адмаўляецца ад класічнага падыходу да ўшанавання гістарычных асоб у аўтэнтычных строях, паказваючы фінал манаршага кахання праз прамую метафару смерці.

Урачыстае адкрыццё новай скульптуры «Жыгімонт і Барбара» адбылося 10 верасня 2026 года. Як [паведамляе](https://madeinvilnius.lt/naujienos/miestas/vilniuje-naujas-paminklas-iamzinta-viena-garsiausiu-sostines-meiles-istoriju/) выданне Made in Vilnius, праект быў рэалізаваны на прыватныя ахвяраванні, а аўтарамі выступілі скульптар Гядзімінас Пекурас і архітэктарка Аўшра Гвільдзене, якія перамаглі ў творчым конкурсе яшчэ ў 2024 годзе.

Месцам для помніка выбраны камерны дворык, адкрыты ў бок віленскіх замкаў і ўтвораны адступленнем ад чырвонай лініі вуліцы Тадэвуша Урублеўскага мадэрнісцкага крыла мясцовай Бібліятэкі імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы. Дворык сімвалічна звернуты ў — былой рэзідэнцыі валадароў Вялікага Княства Літоўскага. За спінай жа самога помніка ўзвышаецца сцяна эклектычнага палаца Клеменціны Тышкевіч, галоўнай сядзібы бібліятэкі.

Бібліятэка імя Урублеўскіх знаходзіцца побач з тэрыторыяй, дзе ў XVI стагоддзі стаяў [палац Радзівілаў на Пушкарні](https://nashaniva.com/401439), і недалёка ад Ніжняга замка. Паводле гарадскіх паданняў, менавіта ў гэтым раёне Жыгімонт Аўгуст загадаў перакінуць мост цераз раку Вільню (сёння яе рэчышча зменена) для таемных візітаў да каханай.

Пераможца творчага конкурсу быў вызначаны яшчэ ў снежні 2024 года, аднак рэалізацыя і ўсталяванне аб'екта занялі амаль два гады. Бюджэт праекта, згодна з першапачатковымі [ўмовамі конкурсу](https://www.ldsajunga.com/post/dekoratyvin%C4%97s-skulpt%C5%ABros-%C5%BEygimantas-ir-barbora-id%C4%97jos-suk%C5%ABrimo-konkursas), абмяжоўваўся сумай у 50 тысяч еўра. Фінансаванне цалкам забяспечылі прыватныя асобы, сярод якіх бізнэсмены браты Візбарасы, мецэнат Відмантас Марціконіс і былая кіраўніца бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта Біруце Буткявічэне.

Падчас цырымоніі адкрыцця арганізатары выкарысталі песню ісландскай спявачкі Б'ёрк «Pramotė» (Прамаці), выпушчаную ў 2024 годзе. Радкі з твора, дзе выканаўца называе свой чэрап «кафедральным саборам», сталі канцэптуальнай асновай для прэзентацыі. Дырэктар бібліятэкі Сігітас Нарбутас падчас выступу адзначыў, што скульптар стварыў для горада своеасаблівы двухвежавы сабор, які захоўвае памяць пра залаты век дзяржавы.

Скульптурная кампазіцыя кардынальна адыходзіць ад традыцыйных уяўленняў пра помнікі закаханым. Галоўны элемент — два залатыя чарапы — розныя па памеры мужчынскі і жаночы. Злева чэрап Жыгімонта Аўгуста, справа — Барбары Радзівіл. Іх анатамічныя дэталі сведчаць пра тое, што гэта не абстрактныя мастацкія вобразы, а дакладныя копіі арыгінальных чарапоў манаршых асоб.

У 1931 годзе ў Вільні адбылася разбуральная паводка, якая затапіла цэнтр горада і падчас ратавальных прац у віленскай кафедры даследчыкі выпадкова натрапілі на схаваную з XVII стагоддзя каралеўскую крыпту, у якой сярод іншых былі [выяўлены](https://nashaniva.com/371172) парэшткі Барбары Радзівіл з пахавальнымі інсігніямі.

Залатыя галовы пакладзеныя на падушку з шэрага граніту, з таго ж матэрыялу выкананы і пастамент, падобны да расцягнутай ушыркі калоны на невысокім стылабаце. На пярэднім баку выгравіраваны надпіс па-літоўску «Žygimantas Augustas » і «Barbora Radvilaitė», а пад ім

змешчаныя асабістыя гербы.

Не ясна, ставіць гэта ў плюс аўтарам ці ў дакор, але варта адзначыць надзвычайны візуальны кантраст гэтага твора.

Залатыя чарапы выглядаюць парадаксальна «жывымі» дзякуючы сваёй анатамічнай дакладнасці і ўласцівасцям матэрыялу — ззянне літаральна льецца знутры пустых вачніц.

Аднак пастамент на кантрасце з імі выглядае штучным, халодным і бяздушным. Сама форма нагадвае калонку, якую ў камп’ютарнай праграме расцягнулі ўздоўж адной з восяў, а пасля аўтаматычны станок выразаў гэтую 3D-мадэль з цэльнага каменя. Іншы ж аўтамат нанёс гравіроўкі з характэрнымі слядамі механічнай, неручной працы. Ствараецца ўражанне, што ў пастаменце зусім няма чалавечай рукі.

Знаёмства пары адбылося ў 1544 годзе — роўна 482 гады таму. Пасля таемнага шлюбу ў Вільні ў ліпені 1547 года Барбара была ўрачыста каранаваная ў Кракаве ў снежні 1550 года. Аднак ужо ў маі 1551 года яна памерла пасля цяжкай хваробы. Выконваючы апошнюю волю жонкі, Жыгімонт Аўгуст пешшу ішоў за яе труной ад Кракава да Вільні. Цела вялікай княгіні і сёння спачывае ў капліцы Віленскага кафедральнага сабора.

Да сустрэчы з каралём Барбара Радзівіл жыла ў маёнтку Геранёны, будучы ў першым шлюбе з ваяводам троцкім Станіславам Гаштольдам. Таксама яе постаць стала асновай для самай вядомай беларускай гарадской легенды пра «Чорную панну Нясвіжа», паводле якой дух памерлай каралевы быў выкліканы Жыгімонтам падчас візіту ў нясвіжскую рэзідэнцыю Радзівілаў.

Да з'яўлення новай кампазіцыі Гедзімінаса Пекураса самым вядомым увасабленнем вобраза вялікай княгіні ў Вільні заставалася скульптура Уладаса Вільджунаса на вуліцы Нямецкай. Яна была створана ў 1982 годзе, і ў часы савецкай улады афіцыйна забаранялася называць помнік імем Барбары Радзівіл — у дакументах ён праходзіў выключна як дэкаратыўны гарадскі элемент.

«Наша Ніва» — бастыён беларушчыны

[ПАДТРЫМАЦЬ](https://patreon.com/nashaniva)

Цяпер чытаюць

Беларуска распачала чэлендж «40 спатканняў», але ўжо на сярэдзіне не хавае расчаравання ў мужчынах[41](https://nashaniva.com/404324/comments)

Каментары15